**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ»**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар УА «ПДУ»

_________________ Д.М. Лазоўскі

Дата зацвярджэння:
Рэгістрацыйны № УД-_________/р.

**Палеаграфія.**

Вучэбная праграма для спецыяльнасці:

1-21 03 01 «Гісторыя (па кірунках)».

Кірунак спецыяльнасці: 1-21 03 01-01 «Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)»

Гісторыка-філалагічны факультэт

Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі

Курс: 3

Семестр: 5

Лекцыі: 34 гадзіны

Практычныя (семінарскія) заняткі: 16 гадзін

Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне: 50

Усяго гадзін па дысцыпліне: 130

Экзамен: 5 семестр

Форма атрымання вышэйшай адукацыі: дзённая

Склаў: Чараўко Віктар Уладзіміравіч,
выкладчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі,
магістр гістарычных навук

2010 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове вучэбнай праграмы «Палеаграфія» для спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя (па кірунках)» 1-21 03 01 «Гісторыя (па кірунках)», кірунак спецыяльнасці: 1-21 03 01-01 «Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)» (дата зацвярджэння _____ 2010 г., рэгістрацыйны № УД-_________/баз.) у адпаведнасці з пп. 6.1., 6.8. – 6.10. «Парадка распрацоўкі, зацвярджэння і рэгістрацыі вучэбных праграм для першай ступені вышэйшай адукацыі».

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці вучэбнай праграмы на пасяджэнні кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі.

__________, № пратакола _____.

Загадчык кафедры
айчыннай і ўсеагульнай гісторыі

________________ Д.У. Дук

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння метадычнай камісіяй гісторыка-філалагічнага факультэта.

__________, № пратакола _____.

Старшыня

________________ І.Г. Лебедзева

Адобрана і рэкамендавана да зацвярджэння Навукова-метадычным саветам УА «ПДУ»

__________, № пратакола _____.

Старшыня

________________ В.В Булах

# ЗМЕСТ

**1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ........................................ 3**

**2. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА ........................................ 5**

**3. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ ........................................ 9**

**4. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА ........................................ 13**

**4.1. Семінарскія заняткі. ........................................ 13**

**4.2. Спіс рэкамендуемай літаратуры. ........................................ 14**

**Асноўная ........................................ 14**

**Даследаванні і дапаможнікі ........................................ 14**

**Факсімільныя выданні і асобныя ілюстрацыі ........................................ 14**

**Дадатковая ........................................ 14**

**4.3. Прыкладныя тэставыя заданні (узор) ........................................ 16**

**4.4. Прыкладны спіс пытанняў да іспыту. ........................................ 17**

**5. ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ ........................................ 18**

## 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Палеаграфія» уяўляе сабой вучэбную дысцыпліну, прысвечаную разгляду гісторыі ўзнікнення, развіцця, пашырэння і вывучэння пісьма.

Палеаграфія – навука, якая займаецца вывучэннем узнікнення, пашырэння і развіцця пісьма. Працяглы час яна мела статус дапаможнай гістарычнай дысцыпліны, вырашаючы вузкае кола практычных задач па вызначэнню аўтарства, часу, месца стварэння і аўтэнтычнасці тэкста. У яе рамках разглядаліся не толькі пытанні вывучэння графічнага боку пісьма, але і даследаваліся вадзяныя знакі, кніжная мініяцюра, пераплёт рукапісаў, сістэмы тайнапісу, пытанні летазлічэння і перавода дат, вырабу кнігі-кодэкса і г.д. На сённяшні дзень адбываецца звужэнне прадмету палеаграфіі да пытанняў графічнага боку пісьма, а іншыя праблемы разглядаюцца ў межах іншых дысцыплін – філіграналогіі, кадзікалогіі, іканаграфіі і інш. Аднак працэс гэты не завершаны, маюцца найноўшыя вучэбныя выданні, выкананыя ў традыцыйным ключы. Улічваючы гэта, а таксама тое, што «Палеаграфія» як вучэбная дысцыпліна зарыентавана не толькі на засваенне тэарэтычнага матэрыяла, але і на развіццё практычных навыкаў і ўменняў працы з рукапісамі, у курс «Палеаграфіі» уключаны таксама асновы філіграналогіі, кадзікалогіі і г.д. пры падкрэсліванні сучасных тэндэнцый адносна вызначэння прадмета палеаграфіі як навуковай дысцыпліны.

«Палеаграфія» як вучэбная дысцыпліна цесна звязана з «Гісторыяй Беларусі», «Гісторыяй Расіі і Украіны», «Крыніцазнаўствам гісторыі Беларусі», «Гістарыяграфіяй гісторыі Беларусі», «Спецыяльнымі гістарычнымі дысцыплінамі». Сувязі носяць розны характар. У межах «Палеаграфіі» чытаюцца тэксты гістарычных крыніц, якія студэнты вывучаюць на «Гісторыі Беларусі», «Гісторыі Расіі і Украіны» і «Крыніцазнаўстве гісторыі Беларусі»; закранаюцца пытанні летазлічэння, надпісаў на камянях, што складае прадмет гістарычнай храналогіі, эпіграфікі, якія вывучаюцца студэнтамі на занятках па прадмеце «Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны»; разглядаецца гісторыя палеаграфіі ў кантэксце гістарыяграфіі гісторыі Беларусі.

**Мэта выкладання і вывучэння дысцыпліны** «Палеаграфія» – праз засваенне і асэнсаванне вучэбнага матэрыяла спрыяць фарміраванню ў студэнтаў сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці, якая дазваляе спалучыць акадэмічныя, сацыяльна-асабовыя і прафесійныя кампетэнцыі для вырашэння задач у прафесійнай і сацыяльнай сферах. Студэнт павінен валодаць наступнымі **кампетэнцыямі:**

–*акадэмічнымі:*

- валодаць базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі па палеаграфіі і выкарыстоўваць іх для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;
- валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;
- валодаць даследчыцкімі навыкамі;
- умець працаваць самастойна;
- валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні задач;

–*сацыяльна-асабовымі:*

- быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
- валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый;
- быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;
- умець працаваць у калектыве;
- быць здольным да самастойнага навучання;
- умець фарміраваць уласнае меркаванне;
- быць здольным выкарыстоўваць атрыманыя веды;

–*прафесійнымі:*

- фармуліраваць і вырашаць задачы, узнікшыя ў працэсе навукова-даследчай і вучэбнай дзейнасці;

- выкарыстоўваць неабходные метады даследавання зыходзячы з патрэб канкрэтнай сітуацыі;
- валодаць сучаснымі электроннымі рэсурсамі і камп'ютэрнымі сродкамі пошука інфармацыі;
- мець навыкі працы з камп'ютэрам;
- дыялектычна мысліць і аргументаваць свой пункт погляду, аналізаваць факты.

Прыярытэтным з'яўляецца фарміраванне і развіццё ўмення працаваць самастойна, развіццё ўмення працаваць з гістарычнымі крыніцамі, спецыяльнай (манаграфічнай і даведачнай) літаратурай.

**Задачы выкладання і вывучэння дысцыпліны:**

- вызначэнне ролі і месца палеаграфіі ў сістэме гістарычных навук;
- вызначэнне і вывучэнне асноўных заканамернасцяў развіцця пісьма;
- развіццё ўменняў выкарыстання міждысцыплінарных сувязяў праз актуалізацыю ведаў і ўменняў па сумежных дысцыплінах (гісторыі Беларусі, гісторыі беларускай літаратуры, крыніцазнаўству гісторыі Беларусі, спецыяльных гістарычных дысцыплінах);
- фарміраванне ўмення чытання кірылічных рукапісаў XI – XVIII стагоддзяў;
- фарміраванне навыкаў вызначэння храналагічнай і тапалагічнай даты рукапісаў, атрыбуцыі рукапісаў, устанаўлення аўтэнтычнасці рукапісаў;
- азнаямленне з методыкай палеаграфічнага даследавання.

Выпускнік павінен:

**–ведаць:**

- асноўныя тэндэнцыі развіцця пісьма;
- асаблівасці развіцця і пашырэння пісьма, яго відаў, тыпаў, разнавіднасцяў на Беларусі;
- спецыяльную тэрміналогію;
- асноўныя факты (падзеі, храналогію, персаналіі) з гісторыі пісьма і з гісторыі палеаграфіі;

**–умець:**

- чытаць рукапісныя кірылічныя тэксты XI – XVIII стагоддзяў;
- працаваць з рукапіснымі кірылічнымі тэкстамі XI – XVIII стагоддзяў, уключаючы пытанні датавання, вызначэння месца стварэння і аўтэнтычнасці рукапісу, і спецыяльнай літаратурай.

У ліку **педагагічных методык і тэхналогій**, што спрыяюць актывізацыі пазнавальнай творчай дзейнасці студэнтаў і набыццю імі вопыту самастойнага вырашэння задач, прапануецца выкарыстоўваць тэхналогію праблемна-модульнага навучання.

Пры **дыягностыцы сфарміраванасці кампетэнцый** выкарыстоўваюцца наступныя галоўныя сродкі: крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты, кантрольныя, праверачныя работы і інш. Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнтаў па «Палеаграфіі» ажыццяўляецца па дзесяцібальнай шкале. Для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў выкарыстоўваюцца крытэрыі, зацверджанныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## 2. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

| ТЭМА І ЗМЕСТ ЛЕКЦЫІ | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **1. ПАЛЕАГРАФІЯ Ў СІСТЭМЕ ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК**<br><br>**1.1. Прадмет, мэта і задачы палеаграфіі: эвалюцыя поглядаў.**<br>Этымалогія паняцця «палеаграфія». Палеаграфія як дапаможная дысцыпліна: мэта і задачы. Пераасэнсаванне ролі і месця палеаграфіі. Палеаграфія як гістарычная навука. Прадмет палеаграфіі. Мэта і задачы палеаграфіі.<br>**1.2. Месца палеаграфіі ў сістэме гістарычных навук. Сувязі палеаграфіі з іншымі спецыяльнымі гістарычнымі дысцыплінамі і навукамі.**<br>Сістэма гістарычных навук. Паняцце спецыяльных гістарычных дысцыплін. Палеаграфія як спецыяльная гістарычная дысцыпліна. Берасталогія і папіралогія. Палеаграфія і сумежныя дысцыпліны: філіграналогія, эпіграфіка, кадзікалогія. Сувязі палеаграфіі з дыпламатыкай, гістарычнай храналогіяй, гістарычнай метралогіяй, геральдыкай, нумізматыкай. Палеаграфія і іканаграфія, гісторыя мастацтва. Сувязі палеаграфіі і гісторыка-філалагічных дысцыплін (тэксталогіі, гісторыі мовы і г.д.). Палеаграфія і крыніцазнаўства.<br>**1.3. Метады палеаграфіі.**<br>Асноўны метад палеаграфіі. Спецыяльныя метады палеаграфіі. | 2 |
| **2. СТАНАЎЛЕННЕ ПАЛЕАГРАФІІ ЯК НАВУКОВАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ПАЛЕАГРАФІІ**<br><br>**2.1. Станаўленне палеаграфіі як навуковай дысцыпліны.**<br>**2.2. Гісторыя беларускай палеаграфіі: практычная палеаграфія.**<br>**2.3. Гісторыя беларускай палеаграфіі: навуковая палеаграфія.**<br>А.М. Аленін. І.М. Каманін. І.А. Сабалеўскі. В.М. Шчэпкін. Я.Ф. Карскі. С.Я. Куль-Сяльверстава. А.І. Груша. | 2 |
| **3. З'ЯЎЛЕННЕ І РАСПАЎСЮДЖВАННЕ ПІСЬМЕННАСЦІ Ў УСХОДНІХ СЛАВЯН**<br><br>**3.1. Пісьменнасць як гісторыка-культурны феномен.**<br>Прычыны ўзнікнення пісьменнасці. Функцыі пісьма. Віды пісьменнасці.<br>**3.2. З'яўлення пісьма ў славян.**<br>Пытанне рунічнай славянскай пісьменнасці. «Черты» і «резы». Выкарыстанне славянамі грэчаскага і лацінскага алфавітаў.<br>**3.3. З'яўленне і пашырэнне кірыліцы і глаголіцы.**<br>Канстанцін Філосаф і Мефодзій. Гістарычны кантэкст з'яўлення славянскага алфавіту. Асноўныя гіпотэзы паходжання кірыліцы і глаголіцы. | 4 |

| | |
|---|---|
| **3.4. Пашырэнне кірыліцы на землях усходніх славян.**<br>**3.5. Кірылічны алфавіт. Лічбавая кірылічная сістэма ўсходніх славян.**<br>Кірылічны алфавіт. «Неўладкаваная» кірыліца. Лічбавая кірылічная сістэма ўсходніх славян. | |
| **4. ПІСЬМО: КЛАСІФІКАЦЫЯ, ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ, АГУЛЬНАЯ СХЕМА РАЗВІЦЦЯ**<br><br>**4.1. Класіфікацыя пісьма.**<br>Тыпы пісьма: царкоўнае, пісьмо чытальных кніг, дзелавое.<br>Графічныя віды пісьма: устаў, паўустаў, скорапіс.<br>Графічныя разнавіднасці пісьма: каліграфічнае, рэгулязаванае, беглае, змешанае.<br>Маюскульнае і мінускульнае пісьмо.<br>**4.2. Прыкметы пісьма.**<br>Тэмп руху. Вага. Вышыня і прапорцыі літар. Сіметрычнасць літар. Суразмернасць літар. Літары, якія выконваюцца больш чым у 2 радка. Вугал нахілу. Пераважная форма рухаў пяра. Звязнасць рухаў. Дукт. Форма літар. Сістэмы памежных сігналаў.<br>**4.3. Агульная схема развіцця пісьма.**<br>Прычыны развіцця пісьма. Фактары паскарэння пісьма.<br>**4.4. Перыядызацыя беларускага пісьма** | 2 |
| **5. КІРЫЛІЧНАЕ ПІСЬМО XI – другой трэці XIV стагоддзя на Беларусі**<br><br>**5.1. Агульная характарыстыка перыяду.**<br>**5.2. Устаў як графічны від пісьма.**<br>Агульная характарыстыка устава. Ранні устаў. Пераходны устаў. Памежныя сігналы.<br>**5.3. Навучанне пісьму. Кніжная прадукцыя і дзелавая дакументацыя.**<br>Навучанне пісьму. Кола кніг і чытачоў. Перапісванне кніг. Старажытнейшыя рукапісныя кнігі з беларускіх зямель: Тураўскае, Полацкае, Аршанскае евангеллі. | 4 |
| **6. КІРЫЛІЧНАЕ ПІСЬМО апошняй трэці XIV – першай паловы XVI стагоддзя на Беларусі**<br><br>**6.1. Агульная характарыстыка перыяду.**<br>**6.2. Устаў і паўустаў.**<br>Устаў. Агульная характарыстыка паўустава. Паўустаў.<br>**6.3. Скорапіс і паўустаў.**<br>Агульная характарыстыка скорапісу. Скорапіс. Памежныя сігналы. Вязь.<br>**6.4. Кніжная прадукцыя і дзелавая дакументацыя.**<br>Кола кніг і чытачоў. Бібліятэкі. Канцылярыя ВКЛ. | 4 |
| **7. КІРЫЛІЧНАЕ ПІСЬМО другой паловы XVI – XVII стагоддзя на Беларусі**<br><br>**7.1. Агульная характарыстыка перыяду.** | 4 |

| | |
|---|---|
| **7.2. Графічныя віды пісьма.**<br>Скорапіс. Устаў і паўустаў. Вязь.<br>**7.3. Кніжная прадукцыя і дзелавая дакументацыя.** | |
| **8. ТАЙНАПІС**<br><br>**8.1. Паняцце і прызначэнне тайнапісу.**<br>**8.2. Сістэмы тайнапісу.**<br>Сістэма чужых пісьмён. Сістэма змененых знакаў. Падліковая сістэма: лічбавы, апісальны, значковы разрады. Акраверш. Вязь у якасці тайнапісу. Іншыя сістэмы тайнапісу. | 1 |
| **9. МАТЭРЫЯЛ І ПРЫЛАДЫ ДЛЯ ПІСЬМА. ТЭХНІКА ПІСЬМА**<br><br>**9.1. Матэрыял і прылады для пісьма ў XI – другой трэці XIV ст.**<br>Пергамін: тэхналогія вырабу. Палімпсесты. Пяро. Чарнілы. Фарбы. Іншыя прылады перапісчыкаў.<br>Васковыя таблічкі. Стыль. Берасцяныя граматы.<br>**9.2. Матэрыял і прылады для пісьма ў апошняй трэці XIV – першай палове XVI ст.**<br>Папера як матэрыял для пісьма. Бамбіцына. Тэхналогія вырабу паперы. Пачатак вытворчасці паперы ў ВКЛ. Пергамент vs папера. Чарнілы.<br>**9.3. Матэрыял і прылады для пісьма ў другой палове XVI – XVII ст.**<br>Вытворчасць паперы на Беларусі. Выкарыстанне пергаміну. Чарнілы.<br>**9.4. Фарматы паперы.**<br>**9.5. Філіграні.**<br>Філігрань і вадзяны знак. Панцюзо і вяржэры. Філіграні прывазной і айчыннай паперы.<br>**9.6. Тэхніка пісьма.** | 2 |
| **10. УПРЫГОЖАННІ Ў РУКАПІСНЫХ КНІГАХ**<br><br>**10.1. Застаўкі, ініцыялы, канцоўкі, маргіналіі.**<br>**10.2. Арнамент.**<br>Паняцце арнаменту. Асаблівасці розных стыляў арнаменту. Старавізантыйскі, тэраталагічны, неавізантыйскі, балканскі, старадрукаваны, паморскі стылі арнаменту. Арнаменты барока, ампір, ракако.<br>**10.3. Мініяцюра.**<br>Паняцце мініяцюры. Тэматыка мініяцюр. Каляровая гама. Ліцавыя рукапісы. Радзівілаўскі летапіс. | 2 |
| **11. ЭВАЛЮЦЫЯ ФОРМЫ І ТЭХНАЛОГІЯ ВЫРАБУ РУКАПІСНАЙ КНІГІ**<br><br>**11.1. Форма кнігі.**<br>Гармонік. Скрутак. Кодэкс. Залежнасць формы кнігі ад матэрыялу.<br>**11.2. Тэхналогія вырабу рукапіснай кнігі.**<br>Элементы кнігі-кодэкса. Аркуш і сшытак. Кніжны блок. Пераплёт. | 2 |

| | |
|---|---|
| | |
| **12. ДАТАВАННЕ РУКАПІСАЎ**<br><br>**12.1. Сістэмы летазлічэння.**<br>Сакавіцкі, ультрасакавіцкі, вераснёўскі гады. Індыкт.<br>**12.2. Ускосныя даты.**<br>**12.3. Датаванне паводле сукупнасці палеаграфічных прыкмет.** | 1 |
| **13. ПАЧАТАК КНІГАДРУКАВАННЯ НА БЕЛАРУСІ**<br><br>**13.1. З'яўленне кнігадрукавання.**<br>**13.2. Пачатак кнігадрукавання на Беларусі.**<br>Пачатак кірылічнага кнігадрукавання. Усходнеславянскае кнігадрукаванне. Францыск Скарына. Кнігадрукаванне на Беларусі.<br>**13.3. Першыя друкаваныя кнігі.**<br>**13.4. Значэнне кнігадрукавання. Узаемны ўплыў рукапіснай і друкаванай кнігі.** | 2 |
| **14. ПІСЬМЕННАСЦЬ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ. БЕЛАРУСКАЯ ПІСЬМЕННАСЦЬ.**<br><br>**14.1. Адметнасці беларускай пісьменнасці.**<br>**14.2. Прычыны і гістарычныя абставіны ўзнікнення беларускай пісьменнасці.**<br>**14.3. Лацінскі алфавіт у гісторыі беларускай пісьменнасці.**<br>**14.4. Кітабы.** | 2 |
| **Усяго за семестр:** | 34 |

## 3. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар тэмы, занятка | Назва тэмы; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторніх гадзін | | Матэрыяльнае забеспячэнне | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | |
| **1.** | **Палеаграфія ў сістэме гістарычных навук** | **2** | | | | |
| 1.1. | Палеаграфія ў сістэме гістарычных навук.<br>1. Прадмет, мэта і задачы палеаграфіі: эвалюцыя поглядаў.<br>2. Месца палеаграфіі ў сістэме гістарычных навук. Сувязі палеаграфіі з іншымі спецыяльнымі гістарычнымі дысцыплінамі і навукамі<br>3. Метады палеаграфіі | 2 | | Прэзентацыя | 2, 3, 4, 5 | |
| **2.** | **Станаўленне палеаграфіі як навуковай дысцыпліны. Гісторыя беларускай палеаграфіі.** | **2** | | | | |
| 2.1. | Станаўленне палеаграфіі як навуковай дысцыпліны. Гісторыя беларускай палеаграфіі.<br>1. Станаўленне палеаграфіі як навуковай дысцыпліны.<br>2. Гісторыя беларускай палеаграфіі: практычная палеаграфія.<br>3. Гісторыя беларускай палеаграфіі: навуковая палеаграфія. | 2 | | Прэзентацыя | 2, 4, 5 | |
| **3.** | **З'яўленне і распаўсюджванне пісьменнасці ў усходніх славян.** | **4** | | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.1. | З’яўленне і распаўсюджванне пісьменнасці ў усходніх славян.<br>1. Пісьменнасць як гісторыка-культурны феномен.<br>2. З’яўлення пісьма ў славян.<br>3. З’яўленне і пашырэнне кірыліцы і глаголіцы.<br>4. Пашырэнне кірыліцы на землях усходніх славян.<br>5. Кірылічны алфавіт. Лічбавая кірылічная сістэма ўсходніх славян | 4 | | Прэзентацыя | 2, 3 | |
| **4.** | **Пісьмо: класіфікацыя, перыядызацыя, агульная схема развіцця.** | **2** | | | | |
| 4.1. | Пісьмо: класіфікацыя, перыядызацыя, агульная схема развіцця.<br>1. Класіфікацыя пісьма.<br>2. Прыкметы пісьма.<br>3. Агульная схема развіцця пісьма.<br>4. Перыядызацыя беларускага пісьма | 2 | | Прэзентацыя | 2 | |
| **5.** | **Кірылічнае пісьмо XI – другой трэці XIV стагоддзя на Беларусі.** | **4** | **4** | | | |
| 5.1. | Кірылічнае пісьмо XI – другой трэці XIV стагоддзя на Беларусі.<br>1. Агульная характарыстыка перыяду.<br>2. Устаў як графічны від пісьма.<br>3. Навучанне пісьму. Кніжная прадукцыя і дзелавая дакументацыя. | 4 | | Прэзентацыя | 2 | |
| 5.2. | Устаў як графічны від пісьма | | 4 | | 1, 2, 14 | Вуснае апытанне / Пісьмовае апытанне |
| **6.** | **Кірылічнае пісьмо апошняй трэці XIV – першай паловы XVI стагоддзя на Беларусі.** | **4** | **8** | | | |
| 6.1. | Кірылічнае пісьмо апошняй трэці XIV – першай паловы XVI стагоддзя на Беларусі.<br>1. Агульная характарыстыка перыяду.<br>2. Устаў і паўустаў | 2 | | Прэзентацыя | 1, 2, 4, 5, 12 | |
| 6.2. | Паўустаў як графічны від пісьма | | 2 | | 1, 2, 12 | |
| 6.3. | Кірылічнае пісьмо апошняй трэці XIV – першай паловы XVI стагоддзя на Беларусі.<br>1. Скорапіс.<br>2. Кніжная прадукцыя і дзелавая дакументацыя | 2 | | Прэзентацыя | 1, 2, 4, 5 | |
| 6.4. | Скорапіс як графічны від пісьма. | | 6 | | 2 | Вуснае |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | апытанне / Пісьмовае апытанне |
| **7.** | **Кірылічнае пісьмо другой паловы XVI – XVII стагоддзя на Беларусі.** | **4** | | | | |
| 7.1. | <u>Кірылічнае пісьмо другой паловы XVI – XVII стагоддзя на Беларусі</u><br>1. Агульная характарыстыка перыяду.<br>2. Графічныя віды пісьма.<br>3. Кніжная прадукцыя і дзелавая дакументацыя. | 4 | | Прэзентацыя | 1, 2, 4, 5 | |
| **8.** | **Тайнапіс.** | **2** | **2** | | | |
| 8.1. | <u>Тайнапіс.</u><br>1. Паняцце і прызначэнне тайнапісу.<br>2. Сістэмы тайнапісу. | 2 | | Прэзентацыя | 2, 3, 4, 5 | |
| 8.2. | <u>Тайнапіс.</u> | | 2 | | | Пісьмовае апытанне |
| **9.** | **Матэрыял і прылады для пісьма. Тэхніка пісьма.**<br><u>Матэрыял і прылады для пісьма. Тэхніка пісьма.</u> | **2** | | | | |
| 9.1. | 1. Матэрыял і прылады для пісьма ў XI – другой трэці XIV ст.<br>2. Матэрыял і прылады для пісьма ў апошняй трэці XIV – першай палове XVI ст.<br>3. Матэрыял і прылады для пісьма ў другой палове XVI – XVII ст.<br>4. Фарматы паперы.<br>5. Філіграні.<br>6. Тэхніка пісьма. | 2 | | Прэзентацыя | | |
| **10.** | **Упрыгожанні ў рукапісных кнігах.** | **2** | | | | |
| 10.1. | <u>Упрыгожанні ў рукапісных кнігах.</u><br>1. Застаўкі, ініцыялы, канцоўкі, маргіналіі.<br>2. Арнамент.<br>3. Мініяцюра | 2 | | Прэзентацыя | 3, 4, 5 | |
| **11.** | **Эвалюцыя формы і тэхналогія вырабу рукапіснай кнігі.** | **2** | | | | |
| 11.1. | <u>Эвалюцыя формы і тэхналогія вырабу рукапіснай кнігі.</u> | 2 | | Прэзентацыя | 2, 5 | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Форма кнігі.<br>2. Тэхналогія вырабу рукапіснай кнігі. | | | | | |
| **12.** | **Датаванне рукапісаў.** | **2** | **2** | | | |
| 12.1. | <u>Датаванне рукапісаў.</u><br>1. Сістэмы летазлічэння.<br>2. Ускосныя даты.<br>3. Датаванне паводле сукупнасці палеаграфічных прыкмет | 2 | | Прэзентацыя | 3, 5 | |
| 12.2. | Датаванне рукапісаў. | | 2 | | 3, 5 | Вуснае апытанне |
| **13.** | **Пачатак кнігадрукавання на Беларусі.** | **2** | | | | |
| 13.1. | <u>Пачатак кнігадрукавання на Беларусі.</u><br>1. З'яўленне кнігадрукавання.<br>2. Пачатак кнігадрукавання на Беларусі.<br>3. Першыя друкаваныя кнігі.<br>4. Значэнне кнігадрукавання. Узаемны ўплыў рукапіснай і друкаванай кнігі | 2 | | Прэзентацыя | 5 | |
| **14.** | **Пісьменнасць на Беларусі ў кантэксце айчыннай гісторыі. Беларуская пісьменнасць.** | **2** | | | | |
| 14.1. | <u>Пісьменнасць на Беларусі ў кантэксце айчыннай гісторыі. Беларуская пісьменнасць.</u><br>1. Адметнасці беларускай пісьменнасці.<br>2. Прычыны і гістарычныя абставіны ўзнікнення беларускай пісьменнасці.<br>3. Лацінскі алфавіт у гісторыі беларускай пісьменнасці.<br>4. Кітабы | 2 | | Прэзентацыя | 2, 4, 5 | |

## 4. ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### 4.1. Семінарскія заняткі.

| Нумар тэмы, занятка | ТЭМА І ЗМЕСТ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | **Устаў як графічны від пісьма.** | 4 |
| 2. | **Паўустаў як графічны від пісьма.** | 2 |
| 3. | **Скорапіс як графічны від пісьма..** | 6 |
| 4. | **Тайнапіс.** | 2 |
| 5. | **Датаванне рукапісаў.** | 2 |
| **Усяго за семестр:** | | 16 |

## 4.2. Спіс рэкамендуемай літаратуры.

<u>**Асноўная**</u>

**Даследаванні і дапаможнікі**


1. Гісторыя беларускай кнігі. У 2 т. Т. 1. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М.В. Нікалаеў; навук. рэд.: В.В. Антонаў, А.І. Мальдзіс. – Мн.: БелЭн, 2009.
2. Груша, А.І. Беларуская кірылічная палеаграфія: вучэб. дапам. для студэнтаў гіст. фак. / А.І. Груша. – Мн.: БДУ, 2006.
3. Калечыц, І.Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны: вучэб.-метад. дапам. / І.Л. Калечыц. – 2-е выд. – Мн.: БДПУ, 2009.
4. Куль-Сяльверстава, С.Я. Беларуская палеаграфія: Навучальны дапаможнік па аднайменнаму курсу / С.Я. Куль-Сяльверстава. – Гродна, 1996.
5. Ячмянёва, І.М. Беларуская палеаграфія: дапам. / І.М. Ячмянёва. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2007.


**Факсімільныя выданні і асобныя ілюстрацыі**


6. Друцк летапісны. Друцкае евангелле. – Мн.: БелЭн, 2001.
7. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: Кніга 28 (1522 – 1552). Кніга запісаў 28 / падрыхт. В. Мянжынскі, У. Свяжынскі. – Мн., 2000.
8. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: Кніга 44: Кніга запісаў 44 (1559 – 1566) / падрыхт. А.І. Груша. – Мн., 2001.
9. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: Кніга 43 (1523 – 1560). Кніга запісаў 43 (копія канца XVI ст.) / падрыхт. В.С. Мянжынскі. – Мн., 2003.
10. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 г. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 523. Кніга публічных спраў 1 / падрыхт. А.І. Груша, М.А. Вайтовіч, М.Ф. Спірыдонаў. – Мн., 2003.
11. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв. Ч. 1. / сост. А.Л. Хорошкевич. – М., 1977.
12. Саверчанка, І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока / І. Саверчанка. – Мн.: Тэхналогія, 1998.
13. Смоленские грамоты XIII –XIV вв. – М.: АН СССР, 1963.
14. Тураў. Тураўскае евангелле. – Мн.: БелЭн, 2004.


<u>**Дадатковая**</u>


15. Айплатов, Г.Н. Русская палеография: Учеб. пособие / Г.Н. Айплатов, А.Г. Иванов. – М.: Логос, 344 с.
16. Беляев, И.С. Практический курс изучения древней русской скорописи для чтения рукописей XV – XVIII столетий / И.С. Беляев. – М.: Синодальная типография, 1907.
17. Беляев, И.С. Практический курс изучения древней русской скорописи для чтения рукописей XV – XVIII столетий / И.С. Беляев. – М., 1907.
18. Груша, А. Рэлігія – мова – пісьмо: пра сутнасць устава і паўустава XI – першай паловы XVI ст. / А.І. Груша // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 9. – С. 23-33.
19. Груша, А.І. Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV – першай паловы XVI ст. / А.І. Груша. – Мн.: Бел. навука, 2006. – 215 с.
20. Жуковская, Л.П.. Развитие славяно-русской палеографии (В дореволюционной России и в СССР) / Л.П. Жуковская. – М., 1963.

21. Истрин, В.А. 1100 лет славянской азбуке. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Наука, 1988.
22. Карский, Е.Ф. Образцы славянского кирилловского письма с Х по XVIII век / Е.Ф. Карский. – Варшава: Тип. Варш. учеб. окр., 1901.
23. Карский, Е.Ф. Славянская кирилловская палеография / Е.Ф. Карский. – М., 1979.
24. Клышка А. Францыск Скарына, альбо як да нас прыйшла кніга. – Мн.: Юнацтва, 1983.
25. Кульбакин, С.М., Славянская палеография / С.М. Кульбакин. – Белград, 2008.
26. Леонтьева, Г.А. Вспомогательные исторические дисциплины: Учебник для вузов. – М.: Владос, 2003.
27. Леонтьева, Г.А. Ключи к тайнам Клио: Палеография. Метрология. Хронология. Геральдика. Нумизматика. Ономастика. Генеалогия. – М.: Просвещение, 1994.
28. Лявонцьева С. Мастацкае афармленне веткаўскіх рукапісных кніг XVIII ст. / С. Лявонцева // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 4. – С. 22-31.
29. Лявонцьева С. Мастацкае афармленне веткаўскіх рукапісных кніг XIX – пачатку XX ст. / С. Лявонцева // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 9. – С. 26-35.
30. Муравьев, А.В.. Палеография. Сборник снимков с русского письма XI –XVIII вв. / А.В. Муравьев. – М.: Изд-во Московского университета, 1963.
31. Сахаров, И.П. Образцы древней письменности / И.П. Сахаров. – СПб.: Издатель Н.А. Шигин, 1891.
32. Сборник снимков с русского письма XIII – XVIII вв. – М., 1908.
33. Соболевский, А.И. Славяно-русская палеография / А.И. Соболевский. – СПб., 1908.
34. Срезневский, И.И. Славяно-русская палеография XI – XIV вв. / И.И. Срезневский. – СПб., 1885.
35. Тихомиров, М.Н. Русская палеография / М.Н. Тихомиров, А.В. Муравьев // [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.opentextnn.ru/history/paleography/tihomirov/.
36. Черепнин, Л.В. Русская палеография / Л.В. Черепнин. – М., 1956.
37. Щепкин, В.Н. Русская палеография / В.Н. Щепкин. – М.: Наука, 1967.

### 4.3. Прыкладныя тэставыя заданні (узор).

**1. Прыклад тэставага задання на выбар аднаго варыянту адказа.**

Палеаграфія – гэта:

1. старажытны рукапіс;
2. гістарычная крыніца;
3. спецыяльная гістарычная дысцыпліна;
4. прылада для пісьма.

**2. Прыклад тэставага задання на выбар некалькіх варыянтаў адказа.**

«Бацькамі» палеаграфіі могуць лічыцца:

1. Жан Мабільон;
2. Бернар Клервоскі;
3. Бернар дэ Манфакон;
4. Ігнацій Лайола.

**3. Прыклад тэставага задання на суаднясенне элементаў.**

Суаднясіце назву і вызначэнне дысцыпліны

| | |
|---|---|
| 1. філіграналогія | А. вывучае тэксты на папірусе; |
| 2. кадзікалогія | Б. вывучае надпісы на цвёрдым матэрыяле; |
| 3. берасталогія | В. вывучае надпісы на берасце; |
| 4. эпіграфіка | Г. вывучае кнігу-кодэкс; |
| 5. папіралогія | Д. вывучае вадзяныя знакі паперы; |

**4. Прыклад тэстававага задання на вызначэнне паслядоўнасці элементаў.**

Вызначыце паслядоўнасць падзей:

1. вылучэнне дыпламатыкі ў асобную дысцыпліну;
2. вылучэнне палеаграфіі ў асобную дысцыпліну;
3. вылучэнне філіграналогіі ў асобную дысцыпліну.

**5. Прыклад тэстававага задання на вызначэнне элемента:**

Старажытнейшая кніга, створаная на беларускіх землях – гэта: ..............

**6. Прыклад тэстававага задання на запаўненне пропускаў у тэксце.**

Запоўніце пропуск:

графічныя віды пісьма змяняліся ў наступнай паслядоўнасці: устаў, ..., скорапіс.

**4.4. Прыкладны спіс пытанняў да іспыту.**

1. Палеаграфія як спецыяльная гістарычная дысцыпліна. Прадмет і задачы палеаграфіі
2. Палеаграфія ў сістэме гістарычных навук. Метады палеаграфіі
3. Станаўленне палеаграфіі як навуковай дысцыпліны
4. Гісторыя беларускай палеаграфіі
5. Папірус як матэрыял для пісьма. Берасцяныя граматы. Помнікі эпіграфікі
6. Пергамін як матэрыял для пісьма
7. Прылады для пісьма старажытных пісцоў
8. Чарнілы: асаблівасці прыгатавання і састаў
9. Трансфармацыя формы кнігі. Кніга-кодэкс
10. Тэхналогія вырабу рукапіснай кнігі-кодэкса
11. Фарматы і пераплёты рукапісаў
12. З’яўленне і распаўсюджванне паперы
13. Тэхналогія вырабу паперы.
14. Узнікненне пісьменства ва ўсходніх славян
15. Кірыліцкая азбука
16. Узнікненне беларускага пісьменства
17. Лацінскае і арабскае пісьмо ў гісторыі Беларусі
18. Устаў як графічны від пісьма
19. З’яўленне і асаблівасці паўустава як графічнага віду пісьма
20. Прычыны з’яўлення і асаблівасці скорапісу як графічнага віду пісьма
21. Вязь як дэкаратыўнае пісьмо
22. Абазначэнне лічбаў літарамі кірыліцы
23. Перавод дат. Летазлічэнне
24. Датаванне рукапісаў
25. Тайнапіс
26. Аздабленне рукапісаў: застаўкі, ініцыялы, канцоўкі, упрыгожанні на палях, арнамент
27. Мініяцюра як гістарычная крыніца
28. Адметнасці старавізантыйскага, тэраталагічнага, новавізантыйскага і балканскага стыляў арнамента
29. Старадрукаваны і барочны арнамент. Паморскі стыль. Ракако і ампір
30. Філіграні
31. Першыя друкаваныя кнігі
32. Узнікненне кнігадрукавання на Беларусі
33. Кніжная прадукцыя і дзелавая дакументацыя на Беларусі ў XI – другой трэці XIV ст.
34. Кніжная прадукцыя і дзелавая дакументацыя на Беларусі ў апошняй трэці XIV – XVII ст.

# 5. ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай дысцыпліне | Прынятае рашэнне (№ пратакола, дата) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя Беларусі | Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі | | |
| Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі | Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі | | |
| Гісторыя Расіі і Украіны | Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі | | |
| Спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны | Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі | | |